ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система»
Отдел маркетинга, социокультурной деятельности
и методической работы

# СИМВОЛЫ ЕДИНЕНИЯ И СВЯЗИ ВРЕМЁН

Информационно-сценарные материалы в помощь проведению мероприятий по государственной символике Республики Беларусь

Кобрин 2025

ББК 78.374.3
С 37

Составитель Т. А. Головейко

Символы единения и связи времён: информационно-сценарные материалы в помощь проведению мероприятий по государственной символике Республики Беларусь / ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система», отдел маркетинга, социокультурной деятельности и методической работы; сост. Т. А. Головейко - Кобрин, 2025. – с. 66.

Информационно-сценарные материалы в помощь проведению мероприятий по государственной символике Республики Беларусь направлены на оказание помощи библиотекарям, педагогам и всем заинтересованным в организации и проведении мероприятий по данной тематике и носят рекомендательный характер.

При подготовке материалов использовались авторские рекомендации, ресурсы Интернета, сценарные разработки ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система», материалы из фонда отдела маркетинга, социокультурной деятельности и методической работы.

© Головейко Т. А.
© Оформление. ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система»
2025

СОДЕРЖАНИЕ

• ВСТУПЛЕНИЕ ________________________________________С. 4

• ИСТОРИЧЕСКАЯ СПРАВКА ______________ __________С. 5 – 8

• ФОРМЫ МЕРОПРИЯТИЙ, РЕКОМЕНДУЕМЫЕ ПО СИМВОЛИКЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ________________________________С. 9

• НАЗВАНИЯ МЕРОПРИЯТИЙ ПО СИМВОЛИКЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ____________________________________________С. 10

• СЦЕНАРИИ, РАЗРАБОТАННЫЕ ОТДЕЛОМ ОБСЛУЖИВАНИЯ И ИНФОРМАЦИИ ГУК «КОБРИНСКАЯ РАЙОННАЯ ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ СИСТЕМА»

• УРОК АЙЧЫНЫ
«РОДНАЙ КРАІНЫ ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ» ________С. 11 – 18

• УРОК АЙЧЫНЫ
«СІМВАЛЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ» _____________________С. 19 – 24

• СЦЕНАРИИ ИЗ ФОНДА ОТДЕЛА МАРКЕТЫНГА, СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ И МЕТОДИЧЕСКОЙ РАБОТЫ

• ЧАС ИНФОРМАЦИИ «МЫ – БЕЛАРУСЫ» ____________С. 25 – 30

• КВЕСТ-ИГРА «ЗНАТОКИ СИМВОЛИКИ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВА»___________________________________С. 31 – 45

• КВЕСТ «СИМВОЛЫ СТРАНЫ – ИСТОРИЯ НАРОДА БЕЛАРУСИ» _____________________________________ С. 45 – 53

• ВИКТОРИНА «В СТРАНЕ СИМВОЛИКА»____________ С. 54 - 55

• ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНО – ПОЗНАВАТЕЛЬНЫЙ ЧАС
«МАЯ РАДЗІМА - БЕЛАРУСЬ»_______________________С. 56 – 62

• ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНАЯ ИГРА – ВИКТОРИНА
«СВАЯ ГУЛЬНЯ»___________________________________С. 63 - 66

# ВСТУПЛЕНИЕ

Каждое современное государство имеет свои символы, которые выражают его политическую самостоятельность и независимость, историю становления и развития, национальную самобытность. Страна, которая не сберегает свои святыни, не ценит свой государственный герб и флаг, не учит новые поколения понимать, ценить и уважать государственные символы, рискует будущим своего народа.

В соответствии со статьёй 19 Конституции Республики Беларусь Государственный флаг, Государственный герб и Государственный гимн являются символами государственного суверенитета республики. Государственные символы Республики Беларусь прошли долгий путь становления, развития и утверждения. В них бережно сохранены черты, отражающие мирные, созидательные цели белорусского народа и государства.

Герб, флаг и гимн – главные символы независимости, передающие историко-культурное наследие нашего народа, подчёркивающее национальный дух и достоинство белорусских граждан. Они отражают определённые стороны нации и государства, давая представление об историческом пути страны и её национальных ценностях.

Согласно Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь: воспитание уважительного отношения к государственным символам (гербу, флагу, гимну Республики Беларусь) – одно из первоочередных условий воспитания гражданственности и патриотизма личности.

В последнее время в Беларуси значительно возросла актуальность изучения и популяризации государственной символики, что обуславливается, в том числе и фактором воспитательного значения, способствующего повышению общей и политической культуры граждан, и, главное, сплочённости граждан вокруг единых национальных ценностей.

**Герб, флаг и гимн Республики Беларусь – символы государственного суверенитета**

***Для справки: в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь, подписанным 12 апреля 2023 года, День Государственного герба Республики Беларусь и Государственного флага Республики Беларусь переименован в День Государственного флага, Государственного герба и Государственного гимна Республики Беларусь. Это позволит отдать дань уважения всем трем государственным символам страны.***

В системе атрибутов государственная символика занимает одно из важнейших мест, является воплощением национальной идеи белорусского государства.

Национальные символы – это условные знаки, образы и предметы, выражающие особенности национальных ценностей, определенные стороны жизни народа и государства.

В соответствии со статьей 1 Закона Республики Беларусь «О государственных символах Республики Беларусь» (далее – Закона) символами Республики Беларусь как суверенного государства являются Государственный флаг Республики Беларусь, Государственный герб Республики Беларусь и Государственный гимн Республики Беларусь.

Герб, флаг и гимн государства – главные символы независимости, передающие историко-культурное наследие нашего народа, подчеркивающие национальный дух и достоинство белорусских граждан. Они отражают определенные стороны нации и государства, давая представление об историческом пути страны и ее национальных ценностях.

**Государственный флаг Республики Беларусь** представляет собой прямоугольное полотнище, состоящее из двух горизонтальных цветных полос: верхней – красного цвета и нижней – зеленого цвета. Отношение ширины полос красного и зеленого цвета – 2:1. Отношение ширины Государственного флага Республики Беларусь к его длине – 1:2. У древка вертикально расположен белорусский национальный орнамент красного цвета на белом поле, составляющем 1/9 длины Государственного флага Республики Беларусь. Государственный флаг Республики Беларусь крепится на древке (флагштоке), которое окрашивается в золотистый (охра) цвет. Отношение ширины Государственного флага Республики Беларусь к длине древка – 1:3.

Применительно к белорусскому Государственному флагу его цвета можно расшифровать следующим образом: белый (серебро) – чистота, непорочность, радость; красный – право, сила, мужество, любовь, храбрость; зеленый – свобода, радость, надежда, здоровье. В

христианской символике белый цвет символизирует жизнь, божественность, само христианство; красный – любовь Бога, огонь веры, кровь Христа; зеленый – юность, жизнь, возрождение, справедливость.

Красный цвет издавна символизирует солнце – главный источник энергии, питающий все жизненные процессы на земле. Вместе с тем красный цвет – олицетворение воли, зрелости, мужества, благородства, власти, солидарности в борьбе за высочайшие идеалы человечества.

Красный цвет на нашем флаге – это цвет знамен дивизий Красной Армии и белорусских партизанских бригад, освобождавших нашу землю от фашистских оккупантов.

Зеленый цвет – это символ Природы, веры в ее неисчерпаемую силу, цвет растительности, которая является основой всего живого. Вместе с тем это символ молодости и энергии, надежды, весны и возрождения. Для белорусского народа, из глубин веков сохранившего традиционную любовь к природе, зеленый цвет, цвет щедрости, доброты, созидания и трудолюбия, является естественным и органичным.

Белый цвет – воплощение безгрешности и духовной чистоты, надежды на благополучное развитие судьбы. Это цвет примирения, веры и святости, цвет мудрости и знаний.

Важнейшая особенность и своеобразие Государственного флага Республики Беларусь – использование национального орнамента как элемента государственной символики. Орнамент на белорусском флаге прямо и непосредственно свидетельствует об этнической принадлежности, указывает на древнее происхождение белорусского народа, на традиции добросовестного труда и строгого порядка.

В основу орнамента на Государственном флаге положен узор «Восходящее солнце», вытканный на полотенце в 1917 году крестьянкой деревни Костелище Сенненского района Матреной Маркевич. В орнаменте флага использованы символы земледелия – ромбы, древнейшие графические вариации которых известны археологам по находкам на территории Беларуси. На протяжении тысячелетий они воплощали материнское, женское начало и связанную с ним идею плодородия земли, ее созидательную силу, а также магическую силу труда. Этот узор широко использовали наши предки.

На Государственном флаге орнамент красного цвета размещен на белом фоне. Такое сочетание соответствует традициям белорусского орнаментального искусства, в котором, как правило, на белую основу наносится цветной (чаще всего красный) узор. Белая основа также несет свое символическое послание: издревле белый цвет связывался со светом полуденного солнца, символизировал чистоту, непорочность, гостеприимство, согласие, свободу.

Таким образом, три полосы Государственного флага – горизонтальные красная и зеленая, вертикальная белая с красным

орнаментом – несут пожелание добра, успеха и процветания всем гражданам Беларуси и всем народам Земли

**Государственный герб Республики Беларусь**

Основа герба - земной шар с контурами Беларуси, над которым восходит золотое солнце. Это два слоя символов жизни. Первый – Земля – основа всего живого. Второй – Солнце – древний космический символ, использовавшийся многими народами на протяжении тысячелетий и означавший божество, источник жизни, жизненную силу.

Лучи солнца, восходящего из-за земного шара, проецируются на контуры территории Республики Беларусь, как бы согревают ее, несут тепло, жизнь, радость. Очертания границ Беларуси, наложенные на солнечные лучи, составляют центр композиции герба.

Солнечные лучи являются одновременно связующим звеном между изображением Беларуси и земного шара. Здесь также заложен глубокий смысл. С одной стороны, Беларусь не нивелируется, не растворяется, а проявляется как самостоятельное, суверенное государство – вынесенные вверх контуры Республики как бы выделяют ее в мировом сообществе и этим подчеркивают ее значимость. С другой стороны, лучи символизируют связь Беларуси с мировым сообществом, указывают, что наша республика не возвышается над мировым объединением народов, а органически вливается в него.

Герб обрамлен пшеничными колосьями, а также цветами льна и клевера, перевитыми лентами государственного флага. Пышные колосья олицетворяют экономическую мощь нашего государства, возможности сильного сельского хозяйства, продукция которого составляет большую часть белорусского экспорта. Клевер - это символ природы, плодородия, очень пышного цветения. Клевер также связан с экономикой нашей страны, ведь является серьезной кормовой культурой. Лен - голубое золото Беларуси, которая входит в число крупнейших стран-производителей льняного волокна. Красная звезда вверху герба символизирует защиту и оборону всего, что находится под ней. С одной стороны, это преемственность с вооруженными силами советского времени, а с другой - и связь с вооруженными силами нашей страны, которые достойно защищают покой граждан. Восходящее солнце, разумеется, является символом жизни и благополучия.

Государственный герб Республики Беларусь может воспроизводиться в многоцветном, двухцветном и одноцветном (в том числе золотом) изображении в графическом или объемном варианте.

Герб отражает лучшие качества и черты национального характера белоруса: трудолюбие, доброжелательность, устремленность к лучшему. Элементы герба хорошо продуманы, несут глубокую смысловую нагрузку и тесно взаимосвязаны между собой.

**Государственный гимн Республики Беларусь** представляет собой музыкально-поэтическое произведение, исполняемое в случаях, предусмотренных Законом и иными законодательными актами Республики Беларусь.

Государственный гимн Республики Беларусь может исполняться в оркестровом, хоровом, оркестрово-хоровом либо в иных вокальных, инструментальных или вокально-инструментальных вариантах. При этом могут использоваться аудио- и видеозапись, а также средства теле- и радиотрансляции. При вокальном и вокально-инструментальном исполнении Государственный гимн Республики Беларусь исполняется полностью, а при его инструментальном исполнении допускается частичное исполнение – проигрываются запев и припев один раз.

Государственный герб, Государственный флаг отражают историю происхождения государства, его структуру, национальные и иные традиции, особенности экономики, природы. Государственный гимн в своей музыке и тексте выражает идеологические устои государства, его историю и устройство, цели и принципы.

Использование государственной символики на учебных занятиях и воспитательных мероприятиях позволяет постепенно и поэтапно приобщать детей и учащуюся молодежь к основам идеологии нашего государства, формировать чувство любви и уважения к Родине, гордости за ее достижения, чувство ответственности за развитие и процветание, способствует формированию активной гражданской позиции.



## ФОРМЫ МЕРОПРИЯТИЙ, РЕКОМЕНДУЕМЫЕ ПО СИМВОЛИКЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

**Вечер краеведческий**

**видеопрезентация**

**видеоурок**

**викторина**

**день информации**

**квест-игра**

**композиция литературно-музыкальная**

**конкурс рисунков**

**конкурс чтецов**

**круглый стол**

**литературно-музыкальная композиция**

**марафон поэтический**

**марафон патриотический**

**мастер-класс**

**премьера книги**

**урок патриотизма**

**урок памяти**

**устный журнал**

**час вопросов и ответов**

**час информации**

**час памяти**

**час поэзии**

**экскурс исторический**

**НАЗВАНИЯ МЕРОПРИЯТИЙ**
**ПО СИМВОЛИКЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**«В символах наши корни»**

**«Высшие ценности Независимости»**

**«Герб, гимн, флаг - символы нашей независимости»**

**«Главная символика Беларуси: роль и значение»**

**«Гордо реет белорусский флаг …»**

**«Гордость страны – Гимн, Герб, Флаг»**

**«Государственные символы Беларуси: вехи истории»**

**«Державность и величие в символах страны»**

**«Душа Беларуси в символах ее»**

**«Истоки государственной символики Беларуси»**

**«История страны, история символов»**

**«Над нами реет флаг Республики моей»**

**«Нам флаг и герб завещано сберечь»**

**«Под символом славным Белорусской державы»**

**«Под флагом, с гербом, гимном достойно путь вершим»**

**«Свято чтить символы»**

**«Символика, рожденная историей»**

**«Символы величия и духа»**

**«Символы гордости, чести и славы»**

**«Символы единения и связи времен»**

**«Символы надежды и добра»**

**«Символы открытости, мира и надежды»**

**«Три главных символа страны»**

**«Три символа на фоне истории»**

**«Символы независимости: прошлое и настоящее»**

## СЦЕНАРИИ, РАЗРАБОТАННЫЕ ОТДЕЛОМ ОБСЛУЖИВАНИЯ И ИНФОРМАЦИИ ГУК «КОБРИНСКАЯ РАЙОННАЯ ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ СИСТЕМА»

### *УРОК АЙЧЫНЫ*
### «РОДНАЙ КРАІНЫ ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ»

***Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне:***

плакаты з дзяржаўнай сімволікай Рэспублікі Беларусь, геральдычнымі сімваламі Кобрына, Кобрынскага раёна;

карта Рэспублікі Беларусь, карта Кобрынскага раёна;

мультымедыйная сістэма; мікрафоны;

выстава «*Сімволіка роднай краіны»;*

відэаролік «*Радзіма мая дарагая»;*

відэапрэзентацыя «*Роднай краіны дзяржаўныя сімвалы»*

*На экране - карта Беларусі*

*Гучыць песня «Молитва» (муз. А. Молчан, сл. Я. Купалы)*

***Чытач***

На карце вялікага свету
Яна як кляновы лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край, твая Айчына,
Жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла: Беларусь!

*Ю. Свірка. Твая Беларусь*

***Вядучы 1.*** Прывітанне, паважаныя сябры! Мая краіна, мая Бацькаўшчына - усяго чатыры словы, але ж, якая моц гучыць у іх, колькі пяшчоты, колькі гонару маюць яны! Наша вечна маладая, квітнеючая і такая старажытная беларуская зямля. Наш родны кут…

***Вядучы 2.*** Лічым, што словы Якуба Коласа з паэмы «Новая зямля» дапамагаюць нам лепш зразумець сэнс слоў «Родны кут»:

Мой родны кут, як ты мне мілы,
Забыць цябе не маю сілы.
Не раз утомлены дарогай

Жыццём вясны маёй убогай
К табе ў думках залятаю
І там душою спачываю. *Я. Колас*

*На экране – прырода Беларусі, слайды на тэму* «Зямля пад белымі крыламі»

***Вядучы 1.*** Да, гэта так.. Мы можам знаходзіцца ў любой з краін свету, але ў нашым сэрдцы заўсёды будзе жыць Беларусь. У нас прыгожая еўрапейская краіна, якую вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч паэтычна назваў «зямлёю пад белымі крыламі». Гэтыя словы сталі сімваламі Беларусі. Досыць сказаць іх - і ўяўляеш сабе нашу цудоўную Радзіму. А яшчэ яе клічуць сінявокай - з-за вялікай колькасці блакітных азёр і рэк. Наогул, існуе шмат слоў-сімвалаў, якія дазваляюць беспамылкова разумець, што гаворка ідзе менавіта пра Беларусь: Францыск Скарына, рэспубліка-партызанка, Брэсцкая крэпасць-герой, Хатынь, Белавежскі зубр, слуцкія паясы, бульба… (*зварот да аўдыторыі - давайце працягнем гэты спіс*). Так, спіс можна працягваць. Мы, як бібліятэкары, не можам не ўнесці ў яго і Нацыянальную бібліятэку Беларусі як сімвал імкнення беларускай нацыі да ведаў, адукацыі. Ітак, гэта прызнаныя неафіцыйныя сімвалы Беларусі ў свеце.

***Чытач***

Неба чыстае і глыбокае
І бярозавы ціхі гай -
Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая, родны край!

У густых садах ты красуешся,
Сілай поўная маладой,
У агнях уся ярка свецішся,
Разліваешся збажыной.

Славай слаўная ты былiннаю,
Залатою сваёй красой,
Майскай песняю салаўінаю
І вясёлкамі над ракой …

Неба чыстае і глыбокае
І бярозавы ціхі гай -
Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая, родны край. *У. Карызна*

***Вядучы 2.*** Сябры! Беларусь - гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, гэта бясконцыя жылы рэк і люстэркі азёр, але гэта і маральны, духоўны скарб народа, які ні ў якім разе нельга страціць, гэта захаванне традыцый, святынь народа, да якіх адносяцца і галоўныя афіцыйныя сімвалы краіны.

Сёння мы пагаворым пра дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь, адзначым значэнне элементаў сімволікі, прасочым, як яны адлюстроўваюць гісторыю краіны.

*На экране – дзяржаўная сімволіка Беларусі*

***Вядучы 1.*** Зварот да гэтай тэмы заканамерны, паколькі быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і не ведаць сімволіку сваёй краіны, недапушчальна. Павага да яе - гэта павага да сваёй зямлі, свайго народу. Краіна толькі тады незалежная, калі яна можа захоўваць свае святыні, і перш за ўсё самыя галоўныя сімвалы краіны - герб, сцяг, гімн.

***Вядучы 2.*** Як і ўсе незалежныя, сувярэнныя краіны свету Беларусь мае сваю дзяржаўную сімволіку. Грамадзяне любой цывілізаванай дзяржавы паважаюць сваю сімволіку. Дзяржава, якая не ахоўвае свае святыні, не вучыць новыя пакаленні разумець іх мову, паважаць, берагчы і абараняць, рызыкуе не толькі свабодай, але і будучыняй свайго народа, Радзімай сваіх дзяцей.

*На экране - артыкул 19 Канстытуцыі «Сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца яе Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн».*

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн з'яўляюцца сімваламі суверэнітэту краіны.

*На экране – пашпарт грамадзяніна Беларусі, прысяга салдата і Прэзідэнта*

***Вядучы 1.*** Дзяржаўныя сімвалы прысутнічаюць на працягу ўсяго жыцця. Герб і сцяг азараюць наша жыццё ад нараджэння да смерці. З'яўляючыся на свет, маленькі чалавек атрымлівае свой першы ў жыцці дакумент - пасведчанне аб нараджэнні, заверанае пячаткай з гербам, а затым - пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Пад дзяржаўным сцягам прысягаюць Радзіме і Прэзідэнт, і малады салдат. Калі здараецца ўсенароднае гора, калі гіне ці памірае хто-небудзь з дастойных сыноў Айчыны, да сцягоў прымацоўваюць чорныя жалобныя ленты, і самі сцягі схіляюцца - перад памяццю паважаных грамадзян. Паклон сцяга - гэта паклон усяго народа. Дзяржаўныя знакі клічуць грамадзян да выканання свайго абавязку, да подзвігаў і рэкордаў.

*На экране – Дзень дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.*

***Вядучы 2.*** Наша беларуская сімволіка яшчэ маладая. Усенароднае прызнанне яна атрымала на рэферэндуме 1995 года, і майскі каляндар папоўніўся Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі

Беларусь, які мы адзначаем у другую нядзелю мая. Гэты дзень – гэта не толькі прыгожы рытуал. Гэта свята Беларусі, яе суверэнітэту і адзінства нацыі.
*На экране – герб Беларусі.*
*Гучыць верш «Герб державы Белорусской» Б. Спрынчана.*

***Чытач***

**Герб державы Белорусской**

Излучает он чудесный
свет.
У него - высокая
судьба,
И, пожалуй, в целом
мире нет Благородней
нашего герба.

Не гривастый лев и не
орёл,
И не рыцарь,
вскинувший клинок,
Утреннего солнца ореол,
Из колосьев и цветов
венок.

Гармонично сочетает
герб, Воедино
сопрягает он
Солнце и колосья, свет
и хлеб,
Человеком чтимый
испокон.

В ярких,
выразительных тонах -
Колоски, цветы
родных полей.
В толстых
геральдических томах
Нет герба красивей и
светлей.

И как этот герб, из года в год, -
Взор, лаская, душу веселя, -
Пусть цветёт, чтоб в счастье жил народ,
Наша белорусская земля! *Б. Спринчан*

***Вядучы 1. Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь****…*У ім кожная дэталь мае важнае значэнне і дае зрокавыя, наглядныя і ў той жа час важныя звесткі пра нашу краіну, наш народ.

Герб Беларусі ўяўляе сабою контур нашай краіны, накладзены на залатыя промні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Вышэй контуру змешчана пяціканцовая зорка. Герб абрамлены вянком з залатых жытніх каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны (ружовы колер), злева - ільну.

Асноўнай канструкцыяй кампазіцыі герба з'яўляецца малюнак зямлі і ўзыходзячага сонца. Гэта два сімвалы жыцця. Першы - зямля - аснова ўсяго жывога. Другі - Сонца - старажытны касмічны знак, які азначае крыніцу жыцця, жыццёвую сілу. Зямны шар – гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы зямлі як раўнапраўных партнёраў, гатова з імі сябраваць і гандляваць, абменьвацца ведамі і сваімі таварамі. Яднанне Зямлі і Сонца – галоўны знак жыцця.

Пяціканцовая зорка – сімвал мужнасці і высокіх памкненняў, знак бяспекі. Размяшчэнне зоркі ў верхняй частцы герба сімвалізуе абарону Радзімы.

Контур краіны знаходзіцца ў сярэдзіне герба, утворанага вянком з залатых каласоў, пераплеценых з аднаго боку ружовымі кветкамі канюшыны, з другога – блакітнымі кветкамі ільну. Вянок, звіты з каласоў жыта, са старадаўніх часоў меў свяшчэнны сэнс для ўсіх славянскіх народаў. Мы, беларусы, адносімся да славян – адной з буйнейшых у Еўропе этнічных груп. Славяне верылі, што пучок або сноп хлебных каласоў – лепшы спосаб звароту да Божых сіл з просьбай аб пасланні ці дараванні новага ўраджаю і працвітання. Вянок з каласоў, пераплеценых кветкамі канюшыны і лёну - знак памяці, бесперапыннай сувязі пакаленняў. Жыта - галоўная збожжавая культура нашай рэспублікі, а канюшына і лён - асноўныя культуры сельскай гаспадаркі Беларусі. Вянок з каласоў сімвалізуе невычарпальную ўрадлівасць беларускай зямлі і шчодрасць беларускага народа.

Каласы герба абвіты чырвона-зялёнай стужкай, на якой знізу ёсць надпіс залацістага колеру – «Рэспубліка Беларусь».

Традыцыйныя і колеры герба. Залаты сімвалізуе багацце і веліч, чырвоны - сілу і мужнасць, сіні - славу і вернасць, зялёны - волю і надзею.

Такім чынам, Дзяржаўны герб нашай краіны – гэта своеасаблівая кніга пра беларускі народ.

*На экране – флаг Беларусі*

***Вядучы 2. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь*** уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палос: верхняй – чырвонага колеру шырынёй у 2/3 і ніжняй – зялёнага колеру ў 1/3 шырыні сцяга. Каля дрэўка вертыкальна размешчаны беларускі нацыянальны арнамент чырвонага колеру на белым полі.

Звычайна гавораць, што наш сцяг мае два колеры – чырвоны, зялёны, але гэта не так, бо беларускі нацыянальны арнамент чырвонага колеру размешчаны на белым полі, і такім чынам - наш сцяг трохкаляровы.

Што азначаюць гэтыя тры колеры? (*пытанне да аудыторыі).*

Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя сувязі, барацьбу за справядлівую справу.

Зялёны колер – гэта колер прыроды, колер палёў і лясоў, якія займаюць большую частку тэрыторыі нашай краіны. Трэба адзначыць, што традыцыя шанавання зялёнага колеру ў Беларусі досыць старажытная. Гэта колер дабра, развіцця, міру.

Белы колер – гэта перш за ўсё колер свабоды. Недарэмна лічаць, што назва нашай краіны – Беларусь – звязана з непахіснай воляй да свабоды. Разам з тым белы колер – гэта колер маральнай чысціні і мудрасці.

Прыгледзімся больш уважліва да арнаменту. Дарэчы, у аснову яго пакладзены ўзор «Узыходзячае сонца», вытканы на ручнік у 1917 годзе простай сялянкай з в. Касцелішча Сененскага павета Матронай Маркевіч. У цэнтры арнаменту ромб з тоўстымі «кручкамі», ці «вёсламі», якія азначаюць вечнасць і рух. А сам ромб – гэта сімвал засеянага поля. Арнамент сімвалізуе працавітасць, працоўнае майстэрства беларускага народа, а таксама ўрадлівасць зямлі.

Такім чынам, беларускі сцяг адлюстроўвае важныя звесткі пра нашу краіну, расказвае гісторыю беларускага народа, заклікае да ажыццяўлення самых высокіх памкненняў да свабоды, росквіту і дружбы народаў.

***Чытач***

Страна моя, родная Беларусь,
Пусть над тобой всегда свободно реет
Наш флаг, в котором радостно слились
Цвета, которые нам всех милее:
Зеленый цвет полей, лугов, лесов,
И красный цвет- цвет жизни и надежды,
И белый цвет, как символ всех веков,
Хранящих в сердце и любовь, и верность.

*На экране – цырымонія адкрыцця плошчы Дзяржаўнага сцягу ў Мінску.*

***Вядучы 1***. Усе мы былі сведкамі ўрачыстай цырымоніі адкрыцця плошчы Дзяржаўнага сцяга ў сталіцы нашай Радзімы, якая адбылася 2 ліпеня 2013 года і ў якой прыняў удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. На цырымоніі адкрыцця была закладзена новая патрыятычная традыцыя прынясення клятвы вернасці Дзяржаўнаму сцягу Рэспублікі Беларусь як сімвалу незалежнасці і дзяржаўнасці.

Плошча Дзяржаўнага сцяга размешчана ў Мінску на праспекце Пераможцаў. Яна ўяўляе сабою круг радыусам 50 м. Уздоўж пешаходнай дарожкі размешчаны сем гранітных стэл з гербамі абласцей і Мінска. Сіметрычна з двух бакоў ад 24-х мятровай лесвіцы размешчаны стэлы з тэкстам Дзяржаўнага гімна і геаграфічнай картай Беларусі.
*На экране – словы гімна Рэспублікі Беларусь* (*гучыць фанаграма гімна Беларусі*)

***Вядучы 2.***

*Слаўся, зямлі нашай слаўнае імя*
*Слаўся, народаў братэрскі саюз!*
*Наша любімая маці – Радзіма,*
*Вечна жыві і квітней, Беларусь!*

Памкненні нашага народа выказаны ў ***Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь***. Беларускі гімн - галоўная ўрачыстая песня краіны. Ён напісаны на словы верша «Мы - беларусы» Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны, музыка Несцера Сакалоўскага і зацверджаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам 2 ліпеня 2002 года. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь выконваецца: пры ўступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на пасаду – пасля прынясення ім прысягі; пры адкрыцці і закрыцці сесій Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;
у час афіцыйнай цырымоніі ўзняцця Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і іншых афіцыйных дзяржаўных цырымоній; у час правядзення цырымоній сустрэч кіраўнікоў замежных дзяржаў з афіцыйнымі візітамі; пры правядзенні воінскіх рытуалаў; пры афіцыйных цырымоніях у час спартыўных спаборніцтваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за яе межамі

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь можа выконвацца: пры адкрыцці помнікаў, памятных знакаў, прысвечаных знамянальным падзеям у жыцці Рэспублікі Беларусь, у гонар знакамітых дзяржаўных, палітычных, грамадскіх і ваенных дзеячаў, народных герояў.

*На экране –сімволіка Брэсцкай вобласці*

***Вядучы 1.*** Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Беларусі таксама маюць свае геральдычныя сімвалы. Больш 20 гарадоў Брэсцкай вобласці маюць свае афіцыйна зацверджаныя гербы. Кобрын у іх ліку.

*На экране –геральдычныя сімвалы Кобрыншчыны.*

Дата 22 ліпеня 2004 года важнай вяхой увайшла ў гісторыю Кобрыншчыны. У гэты дзень Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ № 340 «Об утверждении официальных геральдических символов

Кобринского района». Наш раён мае герб, сцяг і гімн. Але аб гэтым больш падрабязна мы пагаворым на наступным уроку Айчыны.

***Вядучы 2.*** Дарагія сябры! Вось і падышоў да завяршэння першы ўрок, які можна назваць урокам Айчыны. Другі будзе прысвечаны геральдычным сімвалам Кобрыншчыны.

Мне хочацца яшчэ раз нагадаць вам, што мы - грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а беларусы ніколі не забывалі пра свой сцяг і герб, якія сімвалізуюць жыццеўстойлівасць, працавітасць і надзею на шчаслівую будучыню. Герб, флаг і гімн – яны як пашпартныя даныя нашай Радзімы, а значыць, іх гісторыі. Гэта гісторыя Беларусі – наша з вамі!

***Чытач***
Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма!

Я – беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля...

*Н. Гілевіч «Я – беларус!»*

## *УРОК АЙЧЫНЫ*
## «СІМВАЛЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ»

**Вядучы**

Добры дзень усім, хто завітаў на наша мерапрыемства. А чаму яно прысвечана, вы зразумееце, калі адгадаеце загадкі.

Ёсць важная песня ў нашай краіны.
Пачуўшы яе, мы ўстаць усе павінны.
Адзінству людзей у ёй спяваецца слава,
І ўсхваляецца наша дзяржава (Гімн)

Калі пайшлі мы на парад,
Яго нёс мой старэйшы брат.
Нам нельга без яго ніяк,
Бо гэта беларускі … (Сцяг)

Ён дапаўняе гімн і сцяг.
У краіне ён – галоўны знак.
Святыя сімвалы ён мае.
Як ён завецца? Хто з вас знае? (Герб)

Герб, сцяг, гімн… А што яны складаюць цалкам? Так, сапраўды, гэта дзяржаўная сімволіка нашай краіны – Рэспублікі Беларусь. І сённяшняе мерапрыемства прысвечана дзяржаўным сімвалам Беларусі і сімвалам Кобрынскага раёна – нашай малой радзімы.
Сёння на мерапрыемстве прысутнічае старшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна…….. Калі ласка, вам слова, Марына Мікалаеўна.

*Відэаролік*

(Дапаўненне да відэароліка)
12 красавіка 2023 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ нумар 105, якім назва дзяржаўнага свята зменена з «Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь» на «Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь». Новая назва дазваляе аддаць даніну павагі ўсім тром дзяржаўным сімвалам Беларусі. Дата святкавання не змянілася - па-ранейшаму гэтае свята мы адзначаем кожную другую нядзелю мая.
І яшчэ. У студзені 2021 года была зацверджана новая выява дзяржаўнага герба. Сама выява герба засталася той жа, але змяніліся дэталі. Давайце іх адзначым. Увага на экран! Контур краіны стаў залатым замест зялёнага, змяніліся формы каласоў, канюшыны і лёну. Змяніўся колер мацерыкоў на зямным шары - яны сталі цёмна-аранжавымі замест сініх. Сам шар трохі разгарнуўся, зараз на ім бачная тая частка Еўропы, у якой размешчана наша краіна.

Хачу адзначыць, што зварот да гэтай тэмы заканамерны, паколькі быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і не ведаць сімволіку сваёй краіны, сваёй малой радзімы недапушчальна. Павага да сімвалаў краіны - гэта павага да сваёй зямлі, свайго народу.
Зараз працягваем нашу сустрэчу і пагаворым пра сімволіку малой радзімы – Кобрыншчыны. Заклікаю вас слухаць уважліва, па заканчэнні мерапрыемства будзе віктарына, па выніках якой вызначым пераможцаў.

*На экране – назва мерапрыемства «Сімвалы малой радзімы»*
Гучыць фанаграма песні «Родны горад мой» (сл. М. Ярмашука, муз. А. Міхаевіча)
*На экране – карта Кобрынскага раёна, Кобрына*

**Вядучы** Сябры! У кожнага горада, нават самага малога, ёсць свая гісторыя. Давайце зараз разам нагадаем мясціны, з якімі асацыіруецца наш горад Кобрын.
*(зварот да аўдыторыі).*

*На экране – найбольш вядомыя мясціны Кобрына.*
**Вядучы** Для многіх з нас Кобрын першым чынам асацыіруецца менавіта з гэтымі месцамі. Сабор Аляксандра Неўскага, помнік Айчыннай вайне 1812 года (бронзавы арол з распасцёртымі крыламі і лаўровым вянком у кіпцюрах), Спаскі манастыр, ваенна-гістарычны музей імя Суворава, парк культуры і адпачынку… І сучасныя: аквапарк, лядовы палац, шыкоўная набярэжная, помнік князю Уладзіміру і княгіні Вользе, буйнейшы вытворца дзіцячай цацкі з пластмасы ў Беларусі «Палессе»… Словы-сімвалы, неафіцыйныя сімвалы Кобрына. Але сённяшні ўрок прысвечаны геральдычным сімвалам Кобрынскага раёна.

*На экране - геральдыка Брэсцкай вобласці*
**Вядучы** Ужо амаль усе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Брэсцкай вобласці маюць свае афіцыйна зацверджаныя гербы. У кожнага горада свая гісторыя геральдычных сімвалаў. Ёсць яна і на Кобрыншчыне.

**Вядучы** Кобрынскі раён знаходзіцца на заходняй мяжы нашай Радзімы. Яго гісторыя багатая яркімі гістарычнымі падзеямі. Кобрын уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР, што, несумненна, паклала адбітак на гісторыка-культурную спадчыну і міжканфесійныя адносіны. Гэта цалкам адносіцца і да стварэння герба нашага горада і раёна.

*На экране - гербы Кобрына*
У гісторыі горада Кобрына існавалі тры гербы.

*На экране - герб Кобрына 1589 г.*

**Вядучы** Герб Кобрына 1589 года - найстаражытнейшы, які дайшоў да нас. Ён быў падараваны Кобрыну адначасова з Магдэбургскім правам, якое давала гораду права на самакіраванне, развіццё гарадскога будаўніцтва, рамёства, гандлю і прадпрымальніцтва. Указ пра гэта быў падпісаны каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам ІІІ Вазай 10 снежня 1589 года.

*На экране – Ганна Ягелонка, каралева польская і вялікая княгіня літоўская.*

Дадзены ўказ у горад прывезла каралева Ганна Ягелонка і ўрачыста ўручыла яго жыхарам. З таго часу праведная Ганна і лічыцца заступніцай Кобрыншчыны. Дарэчы, права карыстацца гербам, на якім была выява святой Ганны, атрымаў адначасова з Кобрынам і Гарадок (сучасная назва вёскі Гарадзец), і гэта, як сведчаць гісторыкі, адзіны на Беларусі выпадак, калі два гарады мелі супольны магістрат, ужывалі агульную пячатку з адным гербам.

*На экране - малюнкі герба ў двух варыянтах.*

**Вядучы** Герб быў сімвалам горада з 1589 па 1766 год. Захаваліся малюнкі гэтага герба ў двух варыянтах: першы, адбітак пячаткі 1589 года, дзе мы бачым тры постаці; другі, малюнак з прывілея 1662 года, дзе намаляваны Ісус Хрыстос, Багародзіца і святая Ганна (маці Дзевы Марыі), якая ўвасабляе правіцельніцу, заступніцу Кобрына каралеву Ганну Ягелонку. Побач з Ганнай – Маці Боская з немаўлятам на руках, што сімвалізуе мацярынства, міласэрднасць, духоўнасць і спакой, працяг роду чалавечага. Усе трое – з німбамі святых. Старажытны герб завяшчаў нам вялікадушнасць, высакароднасць, росквіт, багацце і яднанне. Аднак у другой палове XVIII стагоддзя Кобрын быў пазбаўлены Магдэбургскага права, а разам з ім і герба. Гэта было звязана з тым, што пасля шэрагу войн і эпідэмій ў сярэдзіне XVIII стагоддзя горад прыйшоў у заняпад. Такім чынам, герб праіснаваў да 1766 года.

*На экране - герб Кобрына 1845 г.*

**Вядучы** Герб 1845 года адлюстроўваў змену гістарычнага становішча. Пасля трэцяга раздзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе Кобрын увайшоў у склад Расійскай імперыі, а неўзабаве набыў статут павятовага горада Гродзенскай губерні. Паводле абласной рэформы Кацярыны ІІ 1775 года і «Грамоте на права и выгоды городам Российской империи» Кобрын атрымаў права на ўласны герб, які, аднак, абавязкова павінен быў складацца з малюнка губернскага герба. Так горад атрымаў герб з малюнкам зубра ў верхняй частцы шчыта, як знака губерні, прыналежнасці Кобрынскага павета да Гродзенскай губерні, і сахі - плуга ў ніжняй, як знака горада, які сімвалізаваў асноўны занятак насельніцтва (малюнак сахі на зялёным полі - знак прыхільнасці

кабрынчан да агародніцтва і земляробству). Гэты герб афіцыйна прызнаваўся ўсімі ўладамі і служыў гораду да 1939 года. Варта адзначыць, што герб 1845 года меў досыць працяглую гісторыю - амаль 100 гадоў.

**Вядучы** У наступны перыяд увага геральдычным пытанням не надавалася. Толькі ў 60-е гады XX стагоддзя ўзрасла цікавасць да гарадской геральдыкі, што было звязана з ростам калекцыяніравання гарадскіх гербаў. Сталі ўносіцца змены ў эмблемы старых гербаў і складацца гербы для новых гарадоў.

*На экране - герб Кобрына 1987 г.*
**Вядучы** У 1987 годзе пачаў сваё існаванне трэці герб Кобрына. Эскіз гэтага герба быў прыняты ў гонар 700-годдзя першага пісьмовага згадвання пра Кобрын. Распрацаваў яго ў той час галоўны архітэктар горада Анатолій Данілюк. Над сімвалічным малюнкам Кобрыншчыны, абазначаным выгібам (заломам) Дняпроўска-Бугскага канала і Мухаўца, распрасцёр свае крылы бусел. Бусел у палёце сімвалізуе ўважлівыя адносіны насельніцтва да прыроды. Гэта сімвал пераемнасці пакаленняў, імкненне з гераічнага мінулага ў мірнае восьмае стагоддзе сваёй гісторыі. Пазней герб 1987 года быў прызнаны несапраўдным з-за сваёй супярэчнасці правілам і традыцыям сусветнай геральдыкі, неадпаведнасці геральдычным патрабаванням. Акрамя таго, белы бусел - гэта знак усёй Беларусі, а не толькі нашага горада. Серп і молат - савецкія знакі, якія адлюстроўваюць перыяд гісторыі Кобрына з 1939 па 1991 год і не з'яўляюцца актуальнымі на сучасным этапе. Ніякіх гістарычных, прыродных, эканамічных асаблівасцяў Кобрына ён не адлюстроўваў. Таму перад Кобрынам паўстала пытанне аб распрацоўцы новага герба.
*На экране - сучасны герб Кобрыншчыны*

**Вядучы** Сябры! Большасць старадаўніх гербаў заслугоўваюць таго, каб працягваць жыць далей. Многія беларускія гарады вяртаюцца да гістарычных вытокаў сваёй сімволікі, і Кобрын не выключэнне. Сучасны герб Кобрыншчыны - гэта герб, створаны па матывах гістарычнага герба 1589 года. Гербы вяртаюцца!
У канцы XX стагоддзя пачаліся дыскусіі пра тое, якім быць гербу горада. Жыхары Кобрына амаль шэсць гадоў думалі, спрачаліся, што ўзяць за аснову новага герба. Каардынацыйны савет па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны пры Кобрынскім райвыканкаме, улічваючы меркаванні большасці гараджан, свой выбар спыніў на магдэбургскім гербе. Дарэчы, гэты герб не толькі зацверджаны Геральдычным саветам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, але і ўхвалены мітрапалітам Філарэтам.

*На экране - фота Філарэта, мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі*

Он символизирует родство и братство.

Красный цвет связан также с борьбой за свободу и справедливость. Это знак победы и счастливой жизни.

Зеленый цвет — цвет добра и мира. Это цвет природы, цвет полей, лесов и лугов.

Белый цвет — цвет свободы, гостеприимность, доброжелательность и мудрость.

Орнамент символизирует трудолюбие, традиции народа.

Из деталей соберите флаг.

**2.2. Гимн — символ Беларуси.**

Соберите слово и получите информацию о еще одном государственном символе, ингм

*(гимн)*

Гимн — не просто музыка, это торжественное музыкально-поэтическое произведение. Гимн исполняют и слушают стоя.

Кто автор гимна?

*(Автором слов белорусского гимна является Владимир Иванович Коризна — известный белорусский поэт. Музыку белорусского гимна написал Нестор Фёдорович Соколовский, белорусский композитор.)*

А сейчас переставьте строчки так, чтобы получилась торжественная песня Республики Беларусь - Гимн.

**1 куплет.**
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Мы, белорусы, -  мірныя людзі,

Мы ў працавітай, вольной сям’і
Шчыра сябруем, сілы гартуем.
Прыпеў:
Наша любімая маці-Радзіма,
Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Возвышя душу, укрепля
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Вечна жыві і квітней, Беларусь!
**2 куплет.**
Мы баранілі родны парог,
Разам з братамі мужна вякамі
Свой здабывалі сцяг перамог!
Ў бітвах за волю, бітвах за долю.
Прыпеў.
**3 куплет.**
Наш запаветны, сонечны шлях.
Дружба народаў — сіла народаў —
Сцяг пераможны —радасці сцяг!
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Прыпеў.

*Давайте, ребята, исполним гимн.* (Исполнение детьми Государственного гимна Республики Беларусь с использованием составленного текста.)




Гимн — главная государственная песня, в которой отражены народная любовь и патриотизм. Гимн звучит в праздники, на торжественных мероприятиях. Он показывает величие, честь, силу,

могущество нашей державы.

### 2.3. Герб — символ Беларуси.

Разгадайте ребус.




*(герб)*

Государственный герб Республики Беларусь содержит зеленый контур нашей страны, наложенный на золотые лучи восходящего над земным шаром солнца. Сверху находится пятиконечная красная звезда. Герб обрамлен венком из золотых колосьев, переплетенных справа розовыми цветками клевера, слева — голубыми цветками льна.

Соедините элементы герба со значением.

| | |
|---|---|
| Земной шар | надежда современных людей на расцвет Беларуси, это главный знак жизни. |
| Символы Земли и Солнца обозначают | знак того, что Республика Беларусь - одно из государств мира. |
| Пятиконечная звезда | символизирует труд и процветание. |
| Венок - | знак безопасности, мужества и высоких помыслов - обозначает готовность каждого жителя Республики к защите Родины. |

## III. Заключительная часть

### 3.1. Упражнение «Мы знаем и гордимся».

Соедините ответ с символом, о котором идет речь.

| | | |
|---|---|---|
| Для создания данного символа использовали красный, белый и зелёный цвета. | | Этот символ украшают цветы льна и клевера |
| В изображении этого символа использовали знак мужества и готовности каждого жителя Республики к защите своей Родины. |  | На этом символе есть национальный орнамент. |
| Государственная песня, в которой | | Торжественное музыкально- |

| | | |
|---|---|---|
| отражены народная любовь и патриотизм. | | поэтическое произведение, которое исполняют стоя. |

**3.2. Построение команд и подведение итогов игры.**

**3.3. Награждение победителей.**

Молодцы! Наше мероприятие заканчивается. ***Я*** хочу пожелать, чтобы вы всегда оставались патриотами своей страны, старательно учились и работали, и, может быть, в честь ваших заслуг перед Родиной когда-нибудь прозвучит гимн Беларуси и поднимется флаг. До свидания! До новых встреч!

**Приложение 1**

**Картинка, которую должны собрать в конце игры игроки команд из 27 собранных пазлов**




**27 пазлов, из которых состоит картинка**


Дзярж
Рэспуб
жаўны гімн
лікі Беларусь
Словы М.Клімковіча, У.Карызны
Музыка Н.Сакалоўскага
Мы, белар
усы - мірныя людзі,
Шчыра ся
Мы ў праца
Слаўся, зя
бруем, сілы гартуем
вітай, вольнай сям'і.
млі нашай светлае імя,
РЭСПУБЛІК
БЕЛАРУС
Слаўся, на
Наша любім
Вечна жыв
родаў братэрскі саюз!
ая маці-Радзіма,
і і квітней, Беларусь!
Разам з бр
Мы баранілі
У бітвах за
Свой здабы
Дзяржаўны
ы герб
ратамі мужна вякамі
родны парог,
волю, бітвах за долю
ывалі сцяг перамог!
Рэспублікі Бе
еларусь
Слаўся, зям
Слаўся, на
Наша любі
лі нашай светлае імя,
родаў братэрскі саюз!
імая маці-Радзіма,
Вечна жыв
Дружба нар
Наш запав




**Приложение 2**

## Маршрутный лист

Название команды №1: ______________________

| *Квест-станция (задание)* | *Максимум баллов на квест-станции (вместе с баллами за предваритель-ный вопрос)* | *Баллы команды за прохожде-ние испытаний на квест-станции* | *Штрафные баллы* | *Итоговые баллы команды за прохождение испытаний на квест-станции* |
|---|---|---|---|---|
| **№1. Соотнести цвет на изображении Государственного флага с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№2.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |
| **№3. Соотнести элемент изображения Государственного герба с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№4.Экспресс-викторины, посвящённая теме Государственного герба** | | | | |
| **№5. Восстановить пропуски и последовательность столбцов в тексте Государственного гимна** | | | | |
| **№6.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **№7.Государственные праздники и даты их празднования** | | | | |
| **№ 8. Соотнести областные города с кратким описанием соответствующего герба** | | | | |
| **№9. Синквейн на тему «Государственная символика Республики Беларусь»** | | | | |
| ***ИТОГО*** | | | | |

## Маршрутный лист

Название команды №2: ____________________

| *Квест-станция (задание)* | *Максимум баллов на квест-станции (вместе с баллами за предваритель-ный вопрос)* | *Баллы команды за прохожде-ние испытаний на квест-станции* | *Штрафные баллы* | *Итоговые баллы команды за прохождение испытаний на квест-станции* |
|---|---|---|---|---|
| **№3. Соотнести элемент изображения Государственного герба с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№4.Экспресс-викторины, посвящённая теме Государственного герба** | | | | |
| **№5. Восстановить пропуски и последовательность столбцов в тексте Государственного гимна** | | | | |
| **№6.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |
| **№1. Соотнести цвет на изображении Государственного флага с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№2.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |
| **№ 8. Соотнести областные города с кратким описанием соответствующего герба** | | | | |
| **№9. Синквейн на тему «Государственная символика Республики** | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Беларусь»** | | | | |
| **№7.Государственные праздники и даты их празднования** | | | | |
| ***ИТОГО*** | | | | |

## Маршрутный лист

Название команды №3: ______________________

| *Квест-станция (задание)* | *Максимум баллов на квест-станции (вместе с баллами за предваритель-ный вопрос)* | *Баллы команды за прохожде-ние испытаний на квест-станции* | *Штрафные баллы* | *Итоговые баллы команды за прохождение испытаний на квест-станции* |
|---|---|---|---|---|
| **№5. Восстановить пропуски и последовательность столбцов в тексте Государственного гимна** | | | | |
| **№6.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |
| **№1. Соотнести цвет на изображении Государственного флага с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№2.Экспресс-викторина, посвящённая теме Государственного флага** | | | | |
| **№3. Соотнести элемент изображения Государственного герба с тем, что он символизирует** | | | | |
| **№4.Экспресс-викторины, посвящённая теме Государственного герба** | | | | |
| **№9. Синквейн на тему «Государственная символика Республики Беларусь»** | | | | |
| **№7.Государственные праздники и даты их празднования** | | | | |
| **№ 8. Соотнести областные города с кратким описанием соответствующего герба** | | | | |
| ***ИТОГО*** | | | | |

## *ВИКТОРИНА*
## «В СТРАНЕ «СИМВОЛИКА»

1. Что олицетворяет флаг, герб, гимн? (Родину)
2. Назовите цвет, которым окрашивали предки белорусов щиты. (Красный).
3. Во что со временем преобразовался щит воина, украшенный разными «счастливыми приметами» и «знаками судьбы»? (В герб)
4. Что означает герб? (Герб – официальная эмблема государства, изображаемая на печатях, бланках государственных органов, денежных знаках и т. п.)
5. Символом чего, в наше время, стал герб, который видетельствовал о родовитости короля, князя? (Символом государства)
6. Перечислите основные национальные духовные ценности белорусов, которые запечатлены в гербе. (Гражданское единство, труд, миролюбие, готовность постоять за свою свободу и суверенность)
7. Какими растениями переплетен герб? (С одной стороны розовыми цветами клевера, с другой – голубыми цветками льна.)
8. Назовите растение, символ связи с миром животных. (Клевер)
9. Символ труда, знак добра и достатка. (Лен)
10. Земной шар – это знак того, что … (Республика Беларусь воспринимает все народы Земли, как равноправных друзей и партнеров)
11. Что жертвовали богам славяне с просьбой о даровании нового урожая? (Пучок или сноп хлебных колосьев)
12. Какой «сноп» в прежние времена почитался чудодейственным, и им украшали угол хаты? («Дожиночный»)
13. Пятиконечная звезда – … (Символ человека и человечества)
14. Для чего служит флагшток? (Флагшток - (от голл. vlaggestok), вертикальный шест для подъема флага.)
15. Сколько цветов имеет белорусский флаг? (3: красный, зеленый, белый)
16. Вернемся в древние времена. Знаком чего до сих пор служит красный цвет? (Знаком Солнца)
17. Зеленый цвет – это цвет Природы, … (Цвет добра, роста, развития, благополучия и мира).
18. Перечислите качества, которые должен свято хранить в своей душе настоящий сын белорусской земли. Эти качества связаны с белым цветом нашего флага. (Свобода, нравственная чистота и мудрость).
19. Каким поступком считается спасение флага в боевых условиях? (Доблестным, героическим)
20. Что означает гимн? (Гимн - (греч. hymnos), торжественная песня. Известны гимны государственные, революционные, военные, религиозные, в честь определенных событий.)

21. Что означает государственный гимн? (Государственный гимн - официальный символ государства (наряду с государственным флагом и государственным гербом). Символ государственного суверенитета Республики Беларусь.)

22. Символический рисунок, графический способ заклинания высших божественных сил. Узор, состоящий из ритмически упорядоченных элементов для украшения каких-либо предметов или архитектурных сооружений. (Орнамент – от лат. ornamentum - украшение)

23. Посредством узоров или орнамента люди выражали различные пожелания и заветы. На государственном флаге Республики Беларусь запечатлена часть наиболее древнего орнамента. Кем и когда была выполнена эта работа? (Работа была выполнена в 1917 г. Крестьянкой Матрёной Маркевич из Сенненского уезда.)

24. Что означают на орнаменте ромбы? (В центре ромб с толстыми «крючками» или «рогами» - это вечность в движении. А сам ромб – это древнейшее изображение башни Земли и Плодородия. Ромбы поменьше – это тоже заклинание – «хлебы», т.е. пища, которую нужно понимать как пищу для духа и пищу для тела.)

25. Что символизирует орнамент? (Трудолюбие, трудовое мастерство)

26. Справедливая форма выяснения воли и желания народа, изобретенная еще в глубокой древности. (Референдум)

27. Назовите дату празднования Дня Государственного герба и Государственного флага? (Праздник День Государственного герба и Государственного флага отмечается второе воскресение мая.)

## *ІНТЭЛЕКТУАЛЬНА-ПАЗНАВАЛЬНЫ ЧАСОПІС*
## «МАЯ РАДЗІМА - БЕЛАРУСЬ»

Добры дзень, паважаныя сябры. Мне вельмі прыемна вітаць вас у добрым настроі. Сёння ў нас сур'ёзная і важная для кожнага з нас тэма, вызначыць якую вы можаце, паслухаўшы невялікую казку.

Уводзіны ў тэму (10 хвілін).

Нарадзіліся ў шчаслівай маці тры сыны — жаданыя, прыгожыя малайцы. Задумалася маці: якія імёны даць сваім сынам, у якое адзенне прыбраць?

Мы хочам, мама,— сказалі сыны,— праславіць цябе на ўвесь свет.

Радуецца маці ды зноў клапоціцца:

Ты, сынок,— кажа першаму,— насі адзенне, па якім усе будуць пазнаваць нашу багатую і мужную зямлю.

І прыбрала яна сына ў чырвона-зялёную вопратку. Чырвонае — як сімвал барацьбы за вольнае жыццё, за сонечнае неба. Зялёнае — пад колер зялёных пушчаў і дубраў, жытнёвых палеткаў і духмяных лугоў-сенажацяў. На вопратцы сына заззяў вясёлы ўзор — арнамент бела-чырвонага колеру.

З гонарам буду насіць свой убор, услаўляць тваё імя,— паабяцаў сын.

Звярнулася маці да другога сына:

А цябе, сынок, буду прасіць, каб заўсёды насіў мой вянок. Я спляту яго з жытняга калосся, кветак канюшыны, ільну, якім багатая наша ўрадлівая зямля.

Сыны пачалі разглядаць незвычайны вянок. У ім шмат сімвалаў: промні сонца на ўсходзе, зорка, а пасярэдзіне вянка — карта і частка зямнога шара.

Буду лічыць за гонар, мама, насіць вянок,— сказаў другі сын.

А ты, мой галасісты сынок, будзеш спяваць маю самую дарагую песню,— прапанавала маці трэцяму сыну і падаравала яму ноты і словы песні.

Узмахнуў сын рукою — і загучала ўрачыстая мелодыя. Заспяваў сын запаветную песню маці:

Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, у бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!

Так і жывуць у маці, нясуць ганаровую вахту тры сыны.

Як вы лічыце, як завецца маці і хто яе сыны?

(Дзеці адказваюць, што маці — гэта Рэспубліка Беларуь *(Радзіма)*, а дзеці — гэта сцяг, герб і гімн Рэспублікі Беларусь.)

Дык аб чым сёння пойдзе гутарка?

*(Дзеці выказваюць свае меркаванні.)* Так, весці размову будзем пра сцяг, герб і гімн Рэспублікі Беларусь.

А як адным словам мы можам назваць вышэй пералічаныя элементы? *(Адказы дзяцей.)*

Каб даведацца, я прапаную вам прадоўжыць прыказкі і прымаўкі. Устаўленыя словы неабходна занесці ў крыжаванку, якую вы бачыце на дошцы.

1. Чалавек без Радзімы, як салавей без... *(песні).*
2. На чужыне — і камар ... (*загіне).*
3. Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне... *(матка).*
4. Скончыў работу — гуляй у… *(ахвоту).*




5. Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны... *(герой).*
6. Родная зямелька, як зморанаму... *(пасцелька).*
7. За багацце розуму не ... *(купіш).*
8. На Радзіме і сонца свеціць ... *(бясконца).*
9. Ад душы працуеш — Радзіму... *(шануеш).*

Мы з вамі жывем у цудоўнай краіне з прыгожай назвай — Беларусь! Рэспубліка Беларусь — незалежная, суверэнная дзяржава. Як і ўсе незалежныя дзяржавы, Беларусь мае сваю сімволіку — герб, сцяг і гімн. У артыкуле 19 раздзела I Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (асноўнага Закона нашай краіны) запісана: “Сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з’яўляюцца яе дзяржаўны сцяп дзяржаўны герб і дзяржаўны гімн”.

А што азначае слова “сімвал”? *(Вучні адказваюць.)* Сімвал — гэта тое, што служыць умоўным знакам: словы, прадметы, дзеянні для абазначэння пэўных паняццяў і ідэй, а таксама прыналежнасці да чаго-небудзь (напрыклад, голуб — сімвал міру).

Раскажыце, калі ласка, з якіх элементаў складаюцца сімвалы нашай дзяржавы? Ці ведаеце вы, што яны азначаюць? *(Вучні адказваюць.)*

Знаёмству з імі і будзе прысвечана наша далейшая праца.

## Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь

Мы захапляемся
Колерам белым –
Снег як узімку
Зямлю ўсю засцеле.
Любім вясновы

Зялёны колер,
Калі адмыслова
Квітнее ваколле.
А колер чырвоны –
Колер світання.
За поступ наш годны –
Сімвал змагання.

Аб якім дзяржаўным сімвале ідзе размова ў вершы? *(Дзяржаўны сцяг.)*

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь уяўляе сабою прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палое: верхняй — чырвонага колеру шырынёй 2/3 і ніжняй — зялёнага колеру 1/3 шырыні сцяга. Каля дрэўка вертыкальна размешчаны беларускі нацыянальны арнамент чырвонага колеру на белым полі, які складае 1/9 даўжыні сцяга. Суадносіны шырыні і даўжыні сцяга — 1:2. Сцяг мацуецца на дрэўку (флагштоку), якое фарбуецца ў залацісты (вохра) колер. Пры цырымоніях і іншых урачыстых мерапрыемствах Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь выкарыстоўваецца з наканечнікам ромбападобнай формы з выявай пяціканцовай зоркі, аналагічнай яе выяве на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь. Наканечнікі вырабляюцца з металу жоўтага колеру.

Дзяржаўны сцяг адлюстроўвае істотна важныя звесткі пра нашу краіну. Кожны грамадзянін павінен добра разумець мову беларускага сцяга, каб асэнсавана шанаваць сцяг і ганарыцца ім.

Як вы лічыце, чаму менавіта ў такія колеры афарбаваны сцяг нашай краіны? З чым асэнсоўваецца чырвоны колер? (*Вучні выказваюць меркаванні.)*

**Вучань 1.** Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя сувязі, братэрства, барацьбу за справядлівую справу. Ён азначае высокае прызначэнне ў лёсе і перамогу. Адначасова гэта знак шчаслівага жыцця. Зялёны колер — колер дабра — гэта перш за ўсё колер свабоды. Недарэмна лічаць, што назва нашай краіны — Беларусь — звязана з непахіснай воляй да свабоды. Разам з тым белы колер — гэта колер маральнай чысціні і мудрасці. І гэтыя якасці павінны свята захоўваць у сваёй душы сапраўдныя сыны беларускай зямлі.

Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную характэрную дэталь — гэта народны ўзор, ці, інакш кажучы, арнамент. Арнамент — сімвалічны малюнак, графічны спосаб заклінання вышэйшых боскіх сіл. Праз узоры ці арнамент людзі выказвалі розныя пажаданні і запаветы яшчэ ў тыя часы, калі не існавала пісьменства. Са шматлікіх варыянтаў беларускага народнага арнаменту на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі

Беларусь адлюстравана частка найбольш старажытнага і тыповага арнаменту. Работа была выканана ў 1917 годзе і належыць простай сялянцы Матроне Маркевіч з вёскі Касцелішча Сенненскага павета. Што азначае гэты арнамент? Што ён сімвалізуе?

Перш за ўсё — працалюбства і працоўнае майстэрства як перадумову кожнага шчаслівага лёсу. Інакш кажучы, выражае самыя істотныя якасці, пазбавіўшыся якіх, народ, і асобны чалавек, губляюць права на дастойнае існаванне. У цэнтры арнамента ромб з тоўстымі "кручкамі", ці "рагамі", ці "вёсламі", якія азначаюць вечнасць і рух. А сам ромб — гэта старадаўняя выява багіні Зямлі і Урадлівасці. Разам з тым, ромб — гэта сімвал засеянага поля. Ён акружаны знакамі, якія заклінаюць аб ураджаі, удачы і здзяйсненні праведных, добрых жаданняў. Больш дробныя ромбы — гэта таксама заклінанні, "хлябы" — гэта значыць ежа, якую трэба разумець як ежу для духа і ежу для цела.

**Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь**




Разгледзьце выяву дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. Пералічыце элементы, якія размешчаны ў цэнтральнай частцы герба.

1. Пяціканцовая зорка
2. Контуры межаў Беларусі
3. Узыходзячае сонца
4. Залатыя сонечныя промні
5. Частка зямнога шара

Пералічыце, што адлюстравана па баках герба.

1. Каласкі жыта
2. Ружовыя кветкі канюшыны
3. Блакітныя кветкі ільну
4. Чырвона-зялёая стужка з тэкстам "Рэспубліка Беларусь"

А ці ведаеце вы, што азначае кожны з элементаў герба? (*Выступленне падрыхтаваных вучняў.)*

**Вучань 2.** Герб Рэспублікі Беларусі вельмі бага, ты па колькасці закладзеных у ім элементаў. Першае, на што зверне ўвагу кожны,— гэта зялёны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, як яна адлюстравана на геаграфічнай карце. Зялёны контур — у залатых промнях узыходзячага сонца. Гэта сімволіка зразумела кожнаму, усе свае думкі грамадзяне скіроўваюць да Айчыны: гэта наша зямля, нам чужой не трэба, але сваёй мы не аддадзім ні пядзі! Мы захаваем яе ў тых межах, у якіх яна нам перададзена папярэднім пакаленнем.

Контур краіны знаходзіцца ў сярэдзіне герба, утворанага вянком з каласоў, пераплеценых з аднаго боку ружовымі кветкамі канюшыны, з

другога — блакітнымі кветкамі ільну. Гэтыя сімвалы ўжо больш складаныя, іх мова патрабуе для разумення пэўных ведаў.

**Вучань 3.** Вянок (з ружаў, пальмавых лісцяў, лаўра і г.д.) спрадвеку выкарыстоўваўся народамі як узнагарода пераможцу і ўвасабляў перамогу. Разам з тым гэта сімвал памяці і непарыўнай сувязі сучаснікаў з продкамі. Вянок, утвораны з пучка жыта, са старадаўніх часоў меў свяшчэнны сэнс для ўсіх славянскіх народаў. Да славян адносяцца таксама рускія, украінцы, палякі — прадстаўнікі гэтых народаў складаюць істотную частку насельніцтва нашай краіны. Славяне верылі, што пучок, або сноп, хлебных каласоў — лепшы сродак звароту да боскіх сіл з просьбай аб пасланні ці дараванні новага ўраджаю і працвітання. Чалавек, ахвяруючы багам частку свайго ўраджаю, як бы казаў: “Вось плод маёй працы і міласці Прыроды. Я будустаранна і нястомна працаваць, і заўтра няхай не пакіне мяне падтрымка вышэйшай сілы!”. Па сённяшні дзень многія жыхары нашых вёсак ставяць ухаце сноп ці пучок каласоў новага ўраджаю як знак працоўнай удачы ў будычым. У мінулыя часы “дажыначны сноп” лічыўся цудадзейным і свяшчэнным і ўпрыгожваў пачэсны кут хаты — адганяў злыя сілы.

Канюшына — гэта сімвал сувязі са стваральным светам жывёл: канём, каровай, авечкай, для якіх яна — лепшы корм. Старажытныя людзі справядліва лічылі, што чалавек — частка ўсяго свету жывых істот, які здольны захаваць сабе жыццё і забяспечыць працвітанне астатняга жывёльнага свету.

Лён — гэта бавоўна Поўначы, цудоўны матэрыял для адзення. Здаўна з ільну выраблялiся прыгожыя і трывалыя тканіны. Лён — сімвал стваральнай працы, знак дабра і дастатку.

**Вучань 2.** Ніжэй контура межаў Рэспублікі Беларусь змешчаны Зямны шар з узыходзячым над ім сонцам і залатымі промнямі. Зямны шар — гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў, гатовая з імі сябраваць і гандляваць, абменьвацца вырабамі і ведамі. Яднанне Зямлі і Сонца — галоўны знак жыцця. У старажытнейшых міфах чалавецтва адлюстравана гэтая сімволіка. Яе можна сустрэць у помніках старажытных Егіпта, Грэцыі і Кітая.

З элементаў герба звяртае на сябе ўвагу чырвоная зорка. Пяцiканцовая зорка — сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх памкненняў. Герб абвіты чырвона-зялёнай стужкай, на якой знізу чытаем надпіс залацістага колеру — “Рэспубліка Беларусь”.

Такім чынам, герб нашай краіны раскрывав сябе як яркая і запамінальная кніга пра беларускі народ.

У гербе адлюстраваны асноўныя нацыянальныя, духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянскае адзінства, праца, імкненне да ўдасканалення сваёй асобы і ўсяго грамадства, міралюбства і

адначасова гатоўнасць пастаяць за сваю свабоду і незалежнасць.

Герб Рэспублікі Беларусь сімвалізуе дзяржаўную волю народа і выкарыстоўваецца ўсімі дзяржаўнымі органамі краіны.

Дзе можна ўбачыць адлюстраванне герба?

- На будынках дзяржаўнай улады
- На дзяржаўных дакументах
- На грашовых знаках
- На дзяржаўных пячатках
- На форме ваеннаслужачых
- На ордэнах і медалях
- На адзенні лётчыкаў і касманаўтаў
- На касцюмах спартсменаў

А ці памятаеце вы, калі мы адзначаем свята Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь?

### Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь

Я прапаную ўсім паслухаць музычны твор, які з'яўляецца галоўнай песняй краіны. *(Слуханне гімна.)*

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь уяўляе сабою музычна-паэтычны твор, які выконваецца ў выпадках, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 года № 301-3 "Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь" і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

## ДЗЯРЖАЎНЫ ГІМН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Музыка Н. *Сакалоўскага*
Словы *М. Клімковіча,*
*У. Карызны*

Мы, беларусы - мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!
Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!

Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Дружба народаў - сіла народаў –
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя выси,
Сцяг пераможны - радасці сцяг!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь была пастаўлена задача стварэння гімна новай, незалежнай Беларусь

У якасці Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт краіны зацвердзіў твор на музыку Н. Сакалоўскага і словы М. Клімковіча, У. Карызны.

У новым Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь захавана музыка Н. Сакалоўскага, якая сімвалізуе пераемнасць гістарычных традыцый беларускага народа, карыстаецца папулярнасцю і павагай у прадстаўнікоў розных пакаленняў грамадзян краіны і па сваіх мастацкіх якасцях адпавядае ўсім патрабаванням, прад'яўляемым да гімнічных твораў.

З прапанаваных варыянтаў тэкстаў гімна на музыку Н. Сакалоўскага камісія і грамадскасць аддалі перавагу вершу М. Клімковіча і У. Карызны. Захоўваючы адпаведнасць меладычным і рытмічным асаблівасцям музыкі Н. Сакалоўскага, гэты паэтычны твор у той жа час адлюстроўвае новыя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя ўмовы развіцця Рэспублікі Беларусь як суверэннай, міралюбівай дзяржавы, падкрэслівае патрыятызм і працавітасць яе грамадзян, сяброўскія адносіны паміж прадстаўнікамі ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць у нашай краіне.

Гэтым жа Указам кіраўнік дзяржавы зацвердзіў Палажэнне аб Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь, якое вызначае статус гімна, умовы і правілы яго выканання і выкарыстання.

Зацвярджэннем Дзяржаўнага гімна завяршыўся працэс фарміравання дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны герб і дзяржаўны сцяг толькі сумесна з дзяржаўным гімнам ствараюць свяшчэнную трыяду нашай дзяржавы.

## *ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ГУЛЬНЯ-ВІКТАРЫНА*
## «СВАЯ ГУЛЬНЯ»

Я спадзяюся, што вам было цікава даведацца аб значэнні дзяржаўных сімвалаў. Цяпер я прапаную вам прадэманстраваць усім прысутным сваю эрудыцыю, а таксама кемлівасць, вынаходлівасць у ходзе гульні на тэму “Беларусь - мая Радзіма”.

Перад тым як пачаць гульню, я прапаную ўсім выбраць сабе па аднаму каляроваму сэрцу, якое вы павінны захаваць да канца гульні. *(Чытачам прапануюцца фігуры ў выглядзе сэрца чатырох колераў: чырвоныя, зялёныя, жоўтыя, блакітныя. Колькасць колераў залежыць ад колькасці ўдзельнікаў (неабходна, каб атрымаліся каманды па 4-5 чалавек).*

***Умовы гульні.*** На камп'ютары экран, які падзелены на сектары па тэмах. Кожная тэма ўключае ў сябе пяць пытанняў рознай ступені цяжкасці: ад 10 да 50 балаў. Калі каманда змагла адказаць на пытанне гульні, то балы яе. Калі адказалі няправільна, то балы здымаюцца. Адказваюць капітаны каманд. Хто адказвае, той выбірае наступны сектар і пытанне.

Кожная каманда складаецца з пяці вучняў: адзін капітан і яшчэ чатыры ўдзельнікі (колькасць каманд залежыць ад колькасці вучняў у класе).

### *Назвы сектараў*

Сюрпрыз (“С”) — камандзе дадаюцца 10 балаў, калі вучні адказваюць на пытанне. Калі каманда не змагла адказаць на пытанне, то балы не здымаюцца.

Музычная паўза (“МП”) — можна адпачыць: расказаць верш, праспяваць песню на беларускай мове і г.д. Балы сектара дадаюцца камандзе.

“Свая гульня” (“СГ”) — капітан, які выбраў гэты сектар, сам ацэньвае кошт пытання і сам адказвае на яго без дапамогі каманды. Калі адказ правільны, то камандзе дадаецца колькасць балаў, калі не — столькі ж балаў здымаецца.

“Кот у мяшку” (“КМ”) — перадача пытання другой камандзе; адказвае на пытанне капітан каманды. Калі адказвае правільна, то колькасць балаў дадаецца камандзе, калі адказвае няправільна — колькасць балаў здымаецца.

| Сектары | Балы | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Сімвал краіны маёй | 10 | 20 | 30 | 40 “КМ” | 50 |
| 2. Мая Радзіма | 10 | 20 | 30 “КМ” | 40 | 50 |
| 3.Скарбонка мудрасці | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | "КМ" | | "СГ" | |
| 4. Славутыя імёны | 10 | 20 | 30 | 40 "КМ" | 50 |
| 5. Зямля паб белымі крыламі | 10 | 20 "МП" | 30 | 40 | 50 |
| 6. У свеце народных традыцый | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 "СГ" |

**1. Сімвал краіны маёй**

Вызначыце па апісанню, аб якіх дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь ідзе гаворка:

10 б. Гэты сімвал нагадвае аб тым, што Рэспубліка Беларусь — адна з краін свету.

20 б. Пералічыце назвы раслін, адлюстраваных на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь.

Чаму менавіта гэтыя сельскагаспадарчыя культуры адлюстраваны на Дзяржаўным гербе?

30 б. Гэты сімвал спрадвеку выкарыстоўваўся як узнагарода пераможцу.

40 б. Гэтыя сімвалы азначаюць надзею сучасных людзей на росквіт Беларусі.

50 б. Гэты сімвал з'яўляецца знакам бяспекі, мужнасці і высокіх памкненняў.

**2. Мая Радзіма**

10 б. Калі ў Рэспубліцы Беларусь адзначаецца свята Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга?

20 б. Кожны год у нашай краіне ладзіцца многа святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да розных памятных падзей. Улетку мы адзначаем надзвычай важнае і любімае народам свята. На яго заўсёды запрашаюць шмат гасцей з розных краін свету. Гэта свята сімвалізуе еднасць народа і дзяржавы, нашу самабытнасць. Адзначаецца яно ў дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў. Як называецца гэта свята і калі адзначаецца? *(Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, або Дзень Рэспублікі — 3 ліпеня.)*

30 б. "КМ". Беларусь — незалежная дзяржава. Але наш народ паважае іншыя народы і ганарыцца братэрскімі сувязямі. У нашай краіне святкуецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Калі адзначаецца гэта свята?
(2 *красавіка.)*

40 б. Як называецца закон, які вызначае жыццё нашай краіны, правы і абавязкі грамадзян? *(Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.)*

50 б. Назавіце важнейшае права чалавека, якое замацавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. (*Права на жыццё.)*

**3. Скарбонка мудрасці *(працягнуць прыказку)***

10 б. Пры сонейку цёпла, пры... *(мамачцы добра).*

20 б. "КМ". Птушка моцная крыламі, а чалавек ... *(сяброўствам).*

30 б. Дарагая тая хатка, дзе ... *(нарадзіла мяне матка).*

40 б. "СГ". Няма смачнейшай вадзіцы, як ... (з *роднай крыніцы).*

50 б. Родная зямля мякчэйшая, чым ... (*чужая пярына).*

**4. Славутыя імёны**

10 б. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ... *(А. Р. Лукашэнка.)*

20 б. Назавіце нашу святую, якую здаўна шануюць як нябесную заступніцу беларускай зямлі, як асветніцу нашых продкаў. (*Еўфрасіння Полацкая.)*

30 б. "С".

*Мой родны кут, як ты мне мілы!*
*Забыць цябе не маю сілы!*

Назавіце аўтара гэтых бессмяротных радкоў. *(Якуб Колас.)*

40 б. Назавіце імя друкара, год і горад, дзе пачалі друкавацца першыя кнігі на старабеларускай мове. (Ф. *Скарына, 1517 г., Прага.)*

50 б. У першага самастойнага ўладара Полацкага княства Рагвалода была дачка. Якімі трыма імёнамі называюць яе? (*Рагнеда, Гарыслава, Анастасія.)*

**5. Зямля пад белымі крыламі**

10 б. Якая птушка з'яўляецца сімвалам нашай краіны? *(Бусел.)*

20 б. Самая магутная жывёла нашых лясоў, якая захавалася толькі ў знакамітай пушчы. Мікола Гусоўскі прысвяціў паляванню на гэтую жывёлу шмат радкоў сваёй паэмы. *(Зубр, Белавежская пушча.)*

30 б. У гушчары старых бароў, як сляза, што ўпала з неба, блішчала вялікае возера... Назавіце самае вялікае па плошчы возера, размешчанае ў Мядзельскім раёне. Пра яго складзена шмат народных легендаў і паданняў, а Максім Танк прысвяціў яму сваю паэму. Побач з ім размешчаны беларускі курорт. *(Возера Нарач.)*

40 б. Якую расліну — сімвал беларускай зямлі — згадвае М. Багдановіч уславутым вершы "Слуцкія паясы"? *(Васілёк.)*

50 б. Самае старажытнае дрэва ў нашых лясах. Гэта асноўная парода, якая дае драўніну для будаўніцтва, вытворчасці, штучных валокнаў. З яго драўніны вырабляюць музычныя інструменты. *(Елка.)*

**6. У свеце народных традыцый**

10 б. Гэта старажытнае свята было прымеркавана да зімовага сонцастаяння. Пазней яго пачатак сталі звязваць з Нараджэннем Хрыстовым. На свята людзі вадзілі казу, мядзведзя, насілі зорку. За песні і пажаданні гаспадары частавалі юнакоў і дзяўчат рознымі прысмакамі. (*Каляды.)*

20 б. Падчас гэтага свята хлопцы і дзяўчаты водзяць карагоды, скачуць праз вогнішча і шукаюць самую чароўную кветку шчасця.

(*Купалле.)*

30 б. На якое вясёлае свята пачыналі гукаць вясну? *(Масленіца.)*

40 б. Як называецца свята, калі ўшаноўваюць памяць памерлых продкаў? *(Дзяды.)*

50 б."СГ". Найвялікшае каляндарнае свята. 3 пашырэннем хрысціянства яго прыстасавалі да ўваскрашэння Хрыста, і яно стала рухомым. (*Вялік- дзень.)*

Пакуль капітаны каманд падлічваюць вынікі, я прапаную кожнаму ўзяць у руку атрыманае раней каляровае сэрца.

А ці гатовыя вы падараваць сваё сэрца Радзіме, месцу, дзе вы нарадзіліся, дзе жылі вышы продкі, дзе жывуць вашы бацькі, родныя людзі? *(Адказы дзяцей.)*

А якая яна, наша Радзіма, наша Беларусь?

*(Дзеці развважаюць.)*

Я прапаную кожнаму з вас адным словам (прыметнікам) ахарактарызаваць Беларусь. Якая яна, наша Радзіма? *(*

Я спадзяюся, што знаёмства з дзяржаўнымі сімваламі нашай Радзімы, традыцыямі, звычаямі роднай зямлі абавязкова працягнецца, калі мы таго пажадаем, бо мы - беларусы. Мы памятаем мінулае, мы ўдасканальваем сучаснае і будзем ствараць будучае.

*Иван Пехтерев*

*«Герб Республики Беларусь»*

В нѐм нет когтей ни льва и ни орла,
В нѐм нет скрещенья злобного мечей –
В нем шар земной, свет солнечных лучей,
В нѐм то, что людям мать-земля дала:
И рожь, в которой слышен зѐрен звон,
И клевер розовый, и синий лѐн.
Но нет в гербе детали ни одной,
Что Беларусь грозит войной
Или грозила хоть кому-нибудь.
Благословлѐн Христом наш мирный путь,
А потому и всѐ, что есть в гербе,
Навек у каждого из нас в судьбе.

Информационно-сценарные материалы в помощь проведению мероприятий по государственной символике Республики Беларусь

# СИМВОЛЫ ЕДИНЕНИЯ И СВЯЗИ ВРЕМЁН

Составитель
Головейко Т. А.
Редактор
Легатюк Л. В.

Компьютерная вёрска Головейко Т. А.
Дизайн обложки Гриневич П. С.

Напечатано на компьютерно-издательской системе
ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система»

ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система»
Отдел маркетинга, социокультурной деятельности и методической работы
ул. Жукова, 12, 225306, г. Кобрин, ул. Жукова, 12
Тел.: 8 (01642)3-85-81
E-mail: kobrinlib@gmail.com